# РЭСУРС НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

**Дыпламатыя як інструмент міжнароднай палітыкі спрадвек была сплавам інтрыг і таямніц, што раз-пораз парушалі тонкую мяжу нябачнасці і набывалі рэальнае ўвасабленне ў войнах, рэвалюцыях, зменах улады... У процівагу яе непрыхаванай крывадушнасці, далёкім ад чысціні памкненням і справам на пэўным этапе развіцця грамадства нарадзілася такая з'ява, як народная дыпламатыя. З той пары непасрэдныя асабістыя кантакты прадстаўнікі розных краін не без поспеху проціпастаўляюць рэверансам і шматхадовым шахматным камбінацыям вялікіх палітыкаў. Сэрцам народнай дыпламатыі ў нашай краіне, пачынаючы з далёкага 1926 года, стала Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Яго бацькі-заснавальнікі – Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Міхась Чарот – выдатна разумелі, што менавіта культура заклікана і можа найбольш пасняхова справіцца з задачай навядзення мастоў паразумення і сяброўства паміж народамі. Сёння таварыства мае партнёрскія адносіны з дзесяткамі грамадскіх аб'яднанняў у краінах Еўропы, Азіі, Амерыкі...**

## ЛЮБОЎ З ПЕРШАЙ СУСТРЭЧЫ

Пачаць расказ пра работу, якую ўжо 83 гады вядзе Грамадская арганізацыя «Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі» (БелТД), чамусьці хочацца не з лічбаў і фактаў аб праведзеных шматлікіх Днях дружбы, вечарах, сустрэчах, выставах, навуковых канферэнцыях і семінарах, што дакладна адлюстроўваюць актыўнасць арганізацыі на ніве ўмацавання міжнародных сяброўскіх кантактаў, а з адной гісторыі.

Дом дружбы



**Гісторыя першая.**

*Пачалося ўсё ў 90-я гады, калі грамадзяне Францыі Даніэль і Жан-Мішэль Ташон упершыню адправіліся ў Беларусь, каб хоць крыху дапамагчы жыхарам нашай краіны ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай аварыі. Штогод прыязджаючы сюды з грузам гуманітарнай дапамогі, яны шчыра захапіліся беларускім краем, палюбілі яго адкрытых людзей і сталі сапраўднымі сябрамі для многіх.*

*У мінулым годзе, паміраючы ў французскім шпіталі (яе муж пайшоў з жыцця раней), Даніэль літаральна трызніла Беларуссю, слухала нашу народную музыку, вяла актыўную перапіску з калектывам Беларускага таварыства дружбы і ў кожным лісце распавядала, што весткі з сінявокай краіны для яе – лепшыя лекі. Сваім тром сынам Даніэль Ташон дала запавет – паехаць у краіну яе душы, прайсціся не раз ходжанымі ёю і мужам сцежкамі, пабачыцца з даўнімі сябрамі сям'і і перадаць апошняе прывітанне. Нядаўна браты Ташон паведамілі ў БелТД, што праз месяц-другі прыедуць. Супрацоўнікі таварыства рыхтуюць для іх праграму паездкі...*

У Статуце Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі запісана, што асноўная мэта яго работы –

папулярызацыя духоўных здабыткаў і культуры Беларусі за межамі нашай дзяржавы і папулярызацыя культуры замежных краін сярод беларускіх грамадзян. Ужо ў самыя першыя гады існавання БелТД былі ўстаноўлены кантакты з такімі вядомымі культурнымі цэнтрамі, як Венская нацыянальная і Нью-Ёркская публічная бібліятэкі, Парыжскі інстытут славяназнаўства, Рымскі інстытут вывучэння Усходняй Еўропы. У той час па запрашэнню таварыства Беларусь наведалі індыйскі паэт і філосаф Рабіндранат Тагор, амерыканскія кінаакцёры Мэры Пікфард і Дуглас Фербэнкс, дэлегацыі грамадскасці Бельгіі, Галандыі, Чэхіі, Фінляндыі. З цікавасцю пачалі знаёміцца з нашай рэспублікай жыхары Аўстрыі, Германіі, Францыі, Нарвегіі, Швецыі, Кітая... Такі быў пачатак шматбаковых міжнародных сувязей, якія перапыніла Другая сусветная вайна.

У пасляваенныя гады дзейнасць таварыства выйшла на новы віток. Кантакты БелТД і супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі больш як 70 краін свету сталі прыкметнай з’явай народнай дыпламатыі. Пасланцоў Беларусі, сярод якіх былі мастакі, музыканты, пісьменнікі і паэты, артысты, іншыя прадстаўнікі творчай эліты рэспублікі, гасцінна прымалі на розных кантынентах.

Час змяніў эканамічную і палітычную рэчаіснасць, але створаная калісьці мадэль народнай дыпламатыі працягвае дзейнічаць і прыносіць плён. Адна са старэйшых грамадскіх арганізацый Беларусі па-ранейшаму імкнецца зблізіць народы розных краін.

Расказваючы пра шматлікія кантакты таварыства, намеснік старшыні прэзідыума БелТД Анатоль Валянцінавіч Шынкевіч акцэнтуе такую думку: «Тыя, хто пабываў у Беларусі некалькі разоў, ніколі ўжо нашымі ворагамі не стануць – яны назаўсёды нашы сябры. Замежныя госці неяк адразу прырастаюць да нашай краіны. І, думаю, сакрэт тут просты – яны жывуць у беларускіх сем'ях, бачаць добразычлівасць нашых людзей. Такая шчырасць вельмі кранае, і замежнікі імкнуцца пабываць у нас яшчэ і яшчэ. Бельгійцы, французы гатовы і самі ехаць сюды, і везці свае сем'і, сваіх сяброў... Вось мы думаем, як павялічыць паток уязнога турызму, а не выкарыстоўваем такіх відавочных магчымасцей. Гэта ж турысты, якіх не трэба агітаваць, – яны самі з настроем сюды паедуць. І будуць пакідаць тут грошы, аплачваючы розныя паслугі...».

За дзесяцігоддзі дзейнасці калектывам БелТД выпрацаваны розныя формы работы. Аднак самай дзейснай па стварэнню сацыяльна-культурнага іміджу нашай краіны за мяжой лічацца традыцыйныя Дні  Беларусі. У час іх правядзення ў тую ці іншую краіну выязджае невялікая група, у складзе якой кіраўнік ад БелТД, прадстаўнікі грамадскасці і самадзейны народны музычны калектыў. Часам прапануецца  невялікая выстава мастацкіх ці дэкаратыўных вырабаў. Амаль штогод Тыдзень беларуска-французскай дружбы праходзіць у Францыі, і ў гэтым бясспрэчная заслуга А.В. Шынкевіча – аднаго са старэйшых работнікаў таварыства, добра вядомага ў гэтай краіне і нават узнагароджанага за актыўнае супрацоўніцтва  французскім ордэнам. Сёлета ў чэрвені Дні Беларусі плануецца правесці на Кіпры. Дарэчы, ладзіць такія сустрэчы ў розных краінах свету БелТД магло б і часцей, але стрымліваючым фактарам выступае дэфіцыт грошай, такі звыклы для грамадскай арганізацыі, якая жыве на спонсарскія ахвяраванні. Фактычна, каб выязное мерапрыемства адбылося, усе выдаткі, уключаючы транспартныя, павінен узяць на сябе прымаючы бок...

## ДОМ, ДЗЕ ЯДНАЮЦЦА СЭРЦЫ

Цяпер, бадай, ужо немагчыма высветліць, як і калі ў будынка па вуліцы Захарава, 28, дзе размяшчаецца Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, з’явілася трапнае і ёмістае імя – Дом дружбы. Хутчэй за ўсё, яго нарадзіла неабходнасць замяніць грувасткую назву на больш кароткую і... цёплую. Хрышчэнне аказалася ўдалым.  У гэтым па-сямейнаму цёплым і ўтульным доме пануе непаўторны дух дружалюбства, яднаюцца чалавечыя імкненні да ўзаемаразумення.

Амаль штовечар, 4–5 разоў на тыдзень, ён расчыняе дзверы для ўсіх жадаючых далучыцца да гістарычнага і культурнага багацця далёкіх і блізкіх краін. Побач з пасламі,





**Станислав ОГУРЦОВ,**
**Почетный консул Республики Кипр в Республике Беларусь:**

– Говорить об эффективности народной дипломатии я могу на конкретном и очень ярком примере. Именно с инициативы простых людей, одним из которых был кипрский бизнесмен Рогирос Константину, еще в начале 1990-х стали налаживаться контакты между Кипром и Беларусью: подписывались соглашения о сотрудничестве, в том числе в культуре, спорте. В 2004 году активисты создали Кипрско-белорусское общество дружбы. А под патронатом Белорусского общества дружбы и культурной связи с зарубежными странами много лет действует общество Беларусь – Кипр. В рамках сотрудничества в столичном Доме дружбы проходит немало интересных встреч и мероприятий не только культурной, но и бизнес-направленности.

Открытие в Минске в мае 2005 года Почетного консульства Республики Кипр в Беларуси является показателем складывающегося позитивного имиджа нашей страны на международной арене. Сегодня мы можем с удовлетворением констатировать, что в деле сближения наших двух народов эта дипломатическая структура играет большую роль. К слову, все сотрудники Почетного консульства Кипра – белорусские граждане, что демонстрирует высокую степень доверия к нам.

За последние годы в Республике Кипр – этом небольшом средиземноморском государстве – всё больше узнают о Беларуси и ее людях, постепенно нашу страну начинают воспринимать не как часть России, а как суверенную и весьма уважаемую державу. С 2005 года консульством выдано около 13 тыс. виз на Кипр гражданам Беларуси, и, что немаловажно, не только туристам. На серьезный уровень выходит экономическое сотрудничество. Так, более 200 белорусских специалистов принимали участие в возведении трех блоков электростанций, работающих на самом современном оборудовании производства Минского электротехнического завода имени Козлова. Этот проект продолжается на Кипре, но им уже заинтересовались и в Греции.

Взаимные контакты приносят плоды и в Беларуси. В нашей стране создано немало успешных кипрско-белорусских совместных предприятий. С целью активизации сотрудничества готовится посещение Беларуси представителями деловых кругов Кипра...

Думается, роль народной дипломатии становится все более значимой сейчас, когда народы мира преодолевают общую напасть – мировой финансовый кризис. Ведь чтобы противостоять его разрушительной силе, нужно объединение и взаимодействие всех государств и всех народов.

іншымі дыпламатычнымі работнікамі – прадстаўнікамі сваіх дзяржаў, тут можна сустрэць самую розную публіку: ад студэнтаў, навучэнцаў каледжаў і ліцэяў да членаў сталічнай ветэранскай арганізацыі, творчай інтэлігенцыі, звычайных гараджан. Варта са шкадаваннем канстатаваць, што завітаць на сяброўскі агеньчык у Дом дружбы маглі б яшчэ многія і многія, і было б ім тут утульна і цікава, але пра будучыя мерапрыемствы звычайна паведамляе толькі сціплая аб'яўка на ўваходных дзвярах – няма сродкаў на рэкламу. Праўда, выратоўваюць назапашаныя за многія гады сувязі работнікаў БелТД: некалькі званкоў – і інфармацыя пра маючы адбыцца вечар пайшла перадавацца з вуснаў у вусны. Узнагародай за прыкладзеныя намаганні для калектыву таварыства служаць поўная зала і шчырае «дзякуй» ад усіх удзельнікаў у канцы вечара...

Хоць паняцце энтузіязму не вельмі стасуецца з рэаліямі рыначнай эканомікі, тым не менш менавіта энтузіястамі, бясконца вернымі справе навядзення мастоў сяброўства, можна назваць членаў невялікага калектыву БелТД. Усяго 8 супрацоўнікаў (у ранейшыя часы тут працавала да 35 чалавек!) імкнуцца не зніжаць устаноўленай іх папярэднікамі шмат гадоў таму высокай планкі.

Распрацаваны на год план работы Дома дружбы – сур'ёзны дакумент, які дыктуе калектыву даволі напружаны працоўны рытм. Не меней як раз у квартал трэба правесці мерапрыемства, прысвечанае кожнай з тых 37 краін, з якімі мае партнёрскія кантакты БелТД. Калі ўлічыць, што адзін супрацоўнік курыруе ад 5 да 9 такіх напрамкаў, міжволі пераконваешся: сяброўства, тым больш на міжнародным узроўні, – гэта вялікая работа. І яна патрабуе не толькі энтузіязму, але і сапраўднага прафесіяналізму. У інтэлектуальным багажы практычна кожнага работніка Дома дружбы – веданне некалькіх замежных моў, шырокі кругагляд, а ў душы – бязмежная любоў да сваёй Радзімы, якую адразу адчуваюць прадстаўнікі іншых зямель і ахвотна заражаюцца гэтым пачуццём.

На такой трывалай аснове працавітасці і самаадданасці будуецца справа міжнароднага сяброўства. У адрас Дома дружбы можна пачуць нямала ўдзячных слоў ад прадстаўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі. Паслы звычайна з задавальненнем адгукаюцца на запрашэнне паўдзельнічаць у мерапрыемствах, а бывае і самі ініцыіруюць правядзенне тут вечароў, прыёмаў ці сустрэч. «Мы не раз мелі магчымасць пераканацца, – гаворыць А.В. Шын-

кевіч, – што ад людзей, якія працуюць у дыпмісіі, залежыць і актыўнасць кантактаў, ды і сам узровень зносін у межах БелТД. Апошнім часам вельмі плённа, дзякуючы нераўнадушнай пазіцыі пасольстваў, ідзе супрацоўніцтва з Венесуэлай, В'етнамам, Балгарыяй, Італіяй, Вялікабрытаніяй».

Але так ці інакш – прыярытэтным напрамкам дзейнасці Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі застаецца наладжванне кантактаў менавіта з грамадскімі аб'яднаннямі, ініцыятыўнымі групамі і асобнымі грамадзянамі за мяжой. Звязаць сяброўствам сэрцы простых людзей – такую рэлігію прапаведуе таварыства...

«Якую ролю адыгрывае народная дыпламатыя ў сучаснай палітыцы? – паўтарае маё пытанне Ніна Сямёнаўна Іванова, старшыня прэзідыума грамадскай арганізацыі «Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі». – Гэта немагчыма ўзважыць. Так, нашы дыпламаты працуюць і робяць шмат, каб Беларусь і беларусаў у свеце ведалі, паважалі, разумелі. Але ёсць дружба звычайных людзей. Кожны год праз наша таварыства цэлымі аўтобусамі прыязджаюць госці з Германіі, Італіі, Аўстрыі, а з Францыі і па некалькі. Гэта тыя, хто займаецца аздараўленнем нашых дзяцей, удзельнічае ў праграмах БелТД, у папулярызацыі беларускіх духоўных і культурных набыткаў. Яны ўлюбёныя ў нашу краіну і дамоў вязуць свае добрыя ўражанні. Вось уявіце – калі кожны падзеліцца гэтым набыткам хоць бы з дзесяткам сваіх суграмадзян, як пашырыцца кола добрых адносін да нас. Гэта не можа не ўплываць на агульны грамадска-палітычны клімат, успрыманне Беларусі за мяжой. Зразумела, мы не скажам, што ўся Аўстрыя ці Францыя нас любіць. Але ёсць пэўны працэнт, і немалы, людзей, якія да нас ставяцца пазітыўна дзякуючы гэтым візітам і міжчалавечым кантактам».

## УЗЯЛІ НАШ БОЛЬ...

Чарнобыльская катастрофа многае падзяліла на «да» і «пасля». Звыклыя з'явы, паняцці, уяўленні перавярнуліся. А справе міжнароднага сяброўства гэтая чорная быль надала, як ні дзіўна, другое дыханне, вывела адносіны на іншы этап, афарбаваўшы іх колерам болю і суперажывання.

Грамадскія арганізацыі многіх краін кінуліся на падтрымку грамадзян Беларусі, якая прыняла на сябе галоўны чарнобыльскі ўдар. Шматлікія гуманітарныя праграмы, натуральна, ажыццяўляліся праз знаёмую замежным сябрам арганізацыю – Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі. Яго ведалі, яму давяралі. Штотыдзень на адрас БелТД прыходзіла па некалькі велікагрузных фургонаў з рэчамі, медыкаментамі, вітамінамі. Толькі па лініі нямецкага Фонду «Дзеці Чарнобыля» медыцынскія ўстановы ва ўсіх кутках нашай краіны атрымалі з таго часу (праграма працягваецца і цяпер) 146 новых апаратаў ультрагукавога даследавання, а для медыкаў, якія павінны былі працаваць на іх, праводзілася спецыяльная падрыхтоўка, арганізоўваліся семінары.

Менавіта чарнобыльская бяда стала пунктам адліку і яшчэ аднаго новага ў гісторыі дабрачыннасці руху. Тысячы маленькіх беларускіх грамадзян нібы птушкі разляталіся летам па свеце, каб прайсці аздараўленне, адпачыць і праз месяц-другі вярнуцца дадому. Дзеці фактычна сталі паўнамоцнымі прадстаўнікамі сваёй радзімы ў замежжы, паслами добрай волі. «Праз наша таварыства штогод каля 5 тыс. дзяцей накіроўвалася на адпачынак у розныя краіны. Цяпер патокі ў 6–7 разоў меншыя. І ў гэтым вінаватыя мы самі: замежныя сябры не могуць зразумець нашых абмежаванняў, яны хочуць, каб адны і тыя ж хлопчыкі ці дзяўчынкі, якія паспелі ўжо стаць ім роднымі, прыязджалі ў госці да паўналецця і столькі разоў, колькі можа прыняць сама сям'я. Ці трэба адмаўляць ім у гэтым?» – разважае А.В. Шынкевіч.

Відавочна, дзяржава мае свае рэзоны ў вырашэнні такіх пытанняў. Але некаторыя моманты зразумець цяжка. І тут дарэчы будзе расказаць яшчэ адну гісторыю.



Старшыня праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Ніна Іванова (злева) пад час сустрэчы з в'етнамскімі журналістамі

**Гісторыя другая.**

*Адна не вельмі багатая бельгійская сям'я на працягу многіх гадоў у сваім гарадку збірала дабрачынны груз для адпраўкі ў Беларусь. Усе дастаўленыя па гуманітарнай праграме рэчы звычайна знаходзілі часовы прытулак на складзе на тэрыторыі Дома дружбы. Раптам правілы змяніліся: захоўваць груз дазвалялася толькі на мытні. З-за дарагоўлі такой паслугі БелТД было вымушана адмовіцца ад гуманітарных грузаў і паведаміла аб гэтым усім сваім партнёрам. Тыя скасавалі свае праграмы, спынілі дагаворы арэнды складскіх памяшканняў... А ў Беларусі тым часам раней прынятае рашэнне аб захоўванні замежных гуманітарных грузаў адмянілі. Калі бельгійскія дабрачынцы, муж і жонка Філіп і Ізабэль Дзю-Буа Д'эш, даведаліся аб змяненні сітуацыі, яны задумалі аднавіць сваю работу. На грошы, што былі падораны ім да 50-гадовага юбілею сумеснага жыцця, Філіп і Ізабэль арандавалі іншы склад, дзе цяпер вядуць рамонт. У хуткім часе яны спадзяюцца зноў пачаць збор рэчаў...*

Кажуць, агульны боль яднае мацней, чым радасць. Пасля 1986-га Беларусь займела яшчэ больш міжнародных сувязей, прыдбала шмат новых сяброў. Дзякуючы дзіцячым паездкам сотні, а можа, і тысячы сем'яў пасябравалі назаўсёды: ездзяць у госці, на вяселлі і хрэсьбіны, дапамагаюць адзін аднаму. Зразумела, не ўсе прыклады дабрачыннасці становяцца шырока вядомымі, але гэты не пакідае сумнення ў шчырасці сяброўства. Адна французская сям'я пабудавала для дзяўчынкі, якая штогод прыязджала да іх на аздараўленне, кватэру ў Магілёве. Іх падапечная даўно замужам, мае сваіх дзяцей, а французы цяпер чакаюць у госці ўжо гэтых малых беларусаў. І гэта не выключэнне, а хутчэй, правіла, калі паяднаныя чарнобыльскімі праблемамі беларускія і замежныя сем'і становяцца амаль што роднымі. Своеасаблівая эстафета дружбы перадаецца праз гады новым пакаленням, і такія кантакты ўносяць надзвычай важкі ўклад у стварэнне іміджу Беларусі ў свеце. Што немалаважна, адпавядаючага сапраўднасці іміджу.

## НА МОВЕ ДУШЫ

Пад дахам Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі ў 1995 годзе знайшла прапіску яшчэ адна структура міжнароднага сяброўства – асацыяцыя параднёных гарадоў. Між іншым, пачыналася гэта справа як адна з праграм БелТД, а цяпер Беларуская грамадская арганізацыя «Параднёныя гарады» (БГАПГ) аб'ядноўвае 31 беларускі горад, які развівае супрацоўніцтва з 263 гарадамі ў 35 краінах свету.

Ніна Сямёнаўна Іванова, якая на грамадскіх пачатках працуе адказным сакратаром арганізацыі «Парадненыя гарады» (старшынёй з'яўляецца мэр Мінска М.Я. Паўлаў), лічыць, што так званы пабрацімскі рух адкрывае вельмі шырокія магчымасці непасрэдных чалавечых кантактаў, бо супрацоўнічаюць не толькі і не столькі мясцовыя ўлады гарадоў-пабрацімаў, а розныя арганізацыі, прадпрыемствы, навучальныя, медыцынскія і культурныя ўстановы, грамадскасць. «У адрозненне ад дагавораў аб супрацоўніцтве, звычайна абмежаваных пэўным тэрмінам, дагаворы аб парадненні гарадоў падпісваюцца аднойчы і назаўсёды і фактычна з'яўляюцца абавязковымі для выканання дакументамі. Як бы ні складваліся ў розныя перыяды адносіны паміж кіраўніцтвам гарадоў, узаемныя кантакты на ўзроўні калектываў звычайна не спыняюцца, а застаюцца вельмі рэальнымі і масавымі. Наогул жа ўсё трымаецца на ініцыятыве, на жаданні неабыякавых людзей сябраваць і прыносіць карысць сваім краінам», – сцвярджае Н.С. Іванова.

Не можа не ўражваць, што раздзеленыя тысячамі кіламетраў, жыхары маленькіх, сярэдніх і вялікіх населеных пунктаў невераҕодным чынам знаходзяць агульную мову і ладзяць такія справы, пра якія палітыкам і не марыцца. Сацыяльныя, эканамічныя, культурныя, навукова-тэхнічныя сувязі, спорт яднаюць і сталых людзей, і зусім юных. Прага спазнаць, як жывуць там, за даляглядам, дапамагчы ці пераняць штонебудзь цікавае, нараджае партнёрства. Так, у Полацку сябры з нямецкага Фрыдрыхсхафена рэалізавалі вельмі важны праект: на ўласныя сродкі набылі для горада ўнікальную ўстаноўку ачысткі вады. Цяпер палачане ганарацца тым, што маюць ледзь не самую чыстую пітную ваду ў Еўропе, а прадстаўнікі горада-пабраціма дапамагаюць у абслугоўванні ўстаноўкі і падрыхтоўцы спецыялістаў, назіраюць за якасцю вады.

Хоць рацыянальны свет усё больш робіць стаўку на канкрэтную аддачу любых зносін і пабрацімскія сувязі актыўна рэалізуюцца ў практычнай плоскасці, у канкрэтных гандлёва-эканамічных праектах, лічыць адказны сакратар БГАПГ, самую вялікую каштоўнасць маюць эмацыянальныя складнікі: менавіта сіла пачуццяў прымушае людзей сустракацца, сябраваць, папулярызаваць адзін аднаго ў сваіх краінах.

«Спадзяюся, што нават у крызісны час гарады-пабрацімы не здадуць пазіцыі супрацоўніцтва, а наадварот, стануць яшчэ больш актыўнымі, – гаворыць Н.С. Іванова. – Бо гэта добраахвотная місія мае вялікае значэнне для ўстанаўлення міжнародных сяброўскіх кантактаў, развіцця народнай дыпламатыі і, вядома, фарміравання пазітыўнага іміджу Беларусі ў свеце. На гэту ідэю і арганізацыя «Параднёныя гарады», і ў цэлым Беларускае таварыства дружбы, па сутнасці, і працуюць».

**Гісторыя трэцяя.**

*Наваполацк ужо даўно мае ў пабрацімах французскі горад Жывор. Намеснікам мэра там быў добры і сумленны чалавек, які на працягу амаль 20 гадоў прыязджаў у Беларусь. Пасля апошніх выбараў у беларускі парламент, якія французскімі СМІ падносіліся тэндэнцыйна, ён выступіў у прэсе і выказаў праўдзівы пункт гледжання, тым больш што ў час выбарчай кампаніі якраз знаходзіўся ў нашай краіне і бачыў ход падзей на свае вочы. Але пры ўсёй хваленай еўрапейскай дэмакратыі за гэты сумленны крок намеснік мэра паплаціўся кар'ерай: члены гарадскога савета не даравалі адкрытае выступленне ў абарону Беларусі і ён фактычна стаў фігурай нон-грата. Тады, заняўшы прынцыповую пазіцыю, кіраўнік пакінуў пасаду. Цяпер ён працуе выкладчыкам і на гэтым месцы даводзіць студэнтам тое, што ведае і думае пра Беларусь...*

## ПАД НАДЗЕЙНЫМ КРЫЛОМ

Сёння, калі наша краіна ўсур'ёз задумалася над стварэннем станоўчага іміджу Беларусі ў свеце, які мог бы, у шэрагу іншых задач, адкрыць дадатковыя магчымасці для эканамічнага прарыву айчынных вытворцаў на замежныя рынкі, роля народнай дыпламатыі становіцца яшчэ больш значнай, а самі кантакты – больш жаданымі і важкімі. Верагодна, у гэтай справе можна і патрэбна прыдумаць нешта новае, разам з тым, і магчымасці такой уплывовай грамадскай арганізацыі, як Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, варта задзейнічаць. А дакладней кажучы – недаравальна было не задзейнічаць. Гэта ж гатовы, напрацаваны гадамі канал інфармавання, не выкарыстаны яшчэ, як кажуць, на ўсе сто працэнтаў, рэсурс!

Супрацоўнікі Дома дружбы ўпэўнены, што таварыства магло б зрабіць больш глыбокімі кантакты з многімі краінамі і ў цэлым пашырыць кола сяброў. (Дарэчы, аб стварэнні ў Беларусі таварыстваў дружбы даўно мараць прадстаўнікі Шры-Ланкі, Палесціны, іншых дзяржаў). Але для таго, каб паўнавартасна весці новы напрамак, штат малаваты – кожны член міні-калектыву і так працуе з перагрузкай, а гэта ж у большасці студэнты – ім яшчэ і вучыцца трэба.



Вечар індыйскай культуры ў Доме дружбы

«Нам хацелася б, і ў гэтым бачацца вялікія перспектывы, больш развіваць маладзёжнае супрацоўніцтва, ажыццяўляць не разавыя спецыяльныя праграмы, як некаторыя грамадскія суполкі, а весці сур'ёзную сістэмную работу – так мы прывыклі, – тлумачыць старшыня БелТД Н.С. Іванова. – Пакуль аб пашырэнні напрамкаў дзейнасці толькі марым. Аднак і ў цяперашніх умовах ні адна з айчынных грамадскіх арганізацый, што займаюцца міжнародным супрацоўніцтвам, не можа параўнацца з намі па колькасна-якасных паказчыках праводзімай работы. Хоць, паўтаруся, маштабы маглі б быць больш значнымі».

Як надаць новы імпульс патрэбнай справе, чым дапамагчы Беларускаму таварыству дружбы і культурнай сувязі, каб атрымаць яшчэ больш карысці ад яго дзейнасці, – асабліва галаву ламаць не трэба. Тут варты пераймання вопыт іншых краін, дзе гэты рух узяла пад надзейнае крыло дзяржава.



**Джузеппе КАРБОНИ, Почетный консул Республики Беларусь в Автономной области Сардиния (Италия):**

– Народная дипломатия часто идет впереди, по сути, опережая официальную дипломатию. Ее язык – это чувства, взаимопонимание. Разве не с чувств зародилась дружба между тысячами итальянских и белорусских семей в ходе осуществления программ по оздоровлению детей после чернобыльской аварии? Те более 300 тыс. маленьких граждан Беларуси, которые за последние 15 лет побывали в нашей стране, стали в определенном смысле белорусскими послами в Италии. И, конечно, такие народные контакты, такая дружба, семейные связи, реализация совместных общественных проектов помогают работе официальной дипломатии.

Открытие белорусского консульства в автономном регионе Сардиния – прямой результат расширения отношений с Беларусью за пределами гуманитарного сотрудничества. Это пример народной дипломатии, которая смогла не просто заинтересовать, но и вовлечь органы власти в активное сотрудничество. В Беларуси с официальными визитами уже побывали многие сардинские делегации, в том числе Регионального правительства, Сардинского регионального совета, провинции Кальяри, различных муниципалитетов, Союза предпринимателей. В свою очередь, к нам на остров приезжали с официальными визитами группа белорусских предпринимателей, делегация Минского района, также состоялась презентация экономического потенциала Республики Беларусь в автономной области Сардиния. Благодаря народной дипломатии родились совместные проекты в области культуры, образования, спорта, экономики. И, кстати, они не остаются незамеченными – широко освещаются как в белорусской, так и в итальянской прессе.

Разумеется, главный инструмент взаимного знакомства – это культурный обмен. Узнать вашу страну поближе и полюбить ее помогают итальянцам гастроли белорусских артистов, среди которых и знаменитые «Харошкі», и ансамбль песни «Цернічка» Дворца культуры и спорта железнодорожников, и детский фольклорный ансамбль «Ровесник», народный ансамбль песни и танца «Спатканне» из Минского района. В рамках Лета белорусской культуры на Сардинии было организовано несколько выставок художественного и фольклорного направления. А жители провинции Кальяри при содействии белорусского посольства смогли ознакомиться с экспозицией военных плакатов и фотографий из Белорусского государственного музея Великой Отечественной войны. Я уже не говорю о том, сколько впечатлений и настоящего азарта подарил итальянцам и белорусам обмен юношескими и детскими футбольными командами в ходе международных спортивных турниров. Настоящим открытием Беларуси для 20 сардинских ребят стала и незабываемая поездка в оздоровительный лагерь «Зубренок» летом прошлого года.

И, пожалуй, самым значимым проектом, в основе которого также лежит народная дипломатия, можно считать создание в Минске итало-белорусского центра профессионального обучения и переподготовки «Сардиния Глобал», который считается ведущим в области сотрудничества и интернациональной кооперации.

Асабліва моцным за апошнія гады стала таварыства дружбы ў В'етнаме: на імідж краіны ў ім працуюць больш за 300 чалавек, і фінансаванне зайздроснае. У Польшчы, Кітаі, Казахстане Дамы дружбы таксама працягваюць плённую дзейнасць. А ў Расіі грамадскую структуру наогул вырашылі ўвесці ў склад Міністэрства замежных спраў як асобнае ўпраўленне па культурных сувязях.

Таварыствы дружбы захаваліся ў Балгарыі, некаторых краінах Балтыі, у Сербіі, Бельгіі, Францыі... І хоць з'яўляюцца яны па сутнасці грамадскімі арганізацыямі, дзяржаўную падтрымку атрымліваюць. Дапамога дзяржавы была б дарэчы і БелТД, мяркуюць у калектыве. Прынамсі, раней так і адбывалася. «Зразумела, як грамадская структура мы імкнуліся здабываць грошы ад спонсараў, як маглі папаўнялі казну таварыства, але бюджэтная фінансавая падтрымка давала магчымасць праводзіць мерапрыемствы больш маштабна і комплексна, – успамінае А.В. Шынкевіч. – Напрыклад, рэгулярна выпускаўся невялікі часопіс, работнікі аддзела друку БелТД пісалі матэрыялы, якія разам з фотаздымкамі адпраўлялі ў рэспубліканскі і замежны друк. Была ў нас і добра аснашчаная фоталабараторыя, дзякуючы гэтаму ў час правядзення Дзён Беларусі мы заўсёды прывозілі за мяжу яркую выставу, каб знаёмства з нашай краінай было больш пазнавальным і наглядным. Цяпер жа не маем магчымасці набыць хоць нейкую фотаэкспазіцыю – проста расказваем пра наш край і стараемся зацікавіць выступленнем самабытнага фальклорнага калектыву».

Сапраўды, крыўдна, што ў час неабмежаваных тэхнічных магчымасцей арсенал сродкаў добраахвотных стваральнікаў іміджу нашай краіны такі бедны. І гэта пры тым, што іншаземцы праяўляюць цікавасць да Беларусі, гатовы і глядзець, і слухаць. «Ведаеце, кожны прыезд беларускай групы ў тую ж Францыю, напрыклад, становіцца падзеяй для мясцовых жыхароў, – распавядае Анатоль Валянцінавіч. – Яны з задавальненнем прыходзяць на канцэрт, купляюць білеты, сродкі ад продажу якіх пералічваюцца ў дабрачынны фонд, а таксама ідуць на аплату нашай паездкі... Мне не аднойчы даводзілася чуць, як у час такіх сустрэч «нашы француз-

зы» – тыя, што супрацоўнічаюць з таварыствам, бываюць у Беларусі, – гаварылі сябрам і знаёмым: «Вось яна – сапраўдная Беларусь, з яе выдатнай культурай, таленавітым і адкрытым народам, а тое, што пішуць у нашым друку – хлусня!».

Думка, што ў любой справы, як у таго медаля, заўсёды ёсць станоўчы і праблемны бок, у адносінах да Дома дружбы як ніколі праўдзівая. Прадмет заўсёднага гонару БелТД, выдатны будынак, узведзены ў 1956 годзе спецыяльна для таварыства, сёння стварае гаспадарам шмат праблем. Яго ўтрыманне абходзіцца ў мільёны рублёў штомесяц, а кожны з гэтых рублёў трэба... папрасіць у спонсараў. Нейкім чынам зарабляць грошы БелТД, як грамадская арганізацыя, не можа, і нават некаторыя свабодныя памяшканні нельга здаваць у арэнду, паколькі гэтага не дазваляе статус архітэктурнага помніка XX стагоддзя. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што таварыства вызвалена ад пэўнай нагрузкі: скасаваны падатак на зямлю і нерухомую маёмасць. Але ад гэтага не лягчэй – эканоміць даводзіцца на ўсім (напрыклад, калектыў даўно адмовіўся ад гарачага водазабеспячэння). Вось таму і аб мерапрыемствах даведацца складана, і свайго інтэрнэтсайта ў Дома дружбы няма, і тэлефонныя размовы абмежаваны зусім сціплымі сумамі... Карацей, сродкаў на больш маштабную сучасную дзейнасць істотна не стае. Відавочна, пасрэдніцтва ў дыялогах культур не прыносіць ды і не можа прынесці аддачы, якую магчыма было б патрымаць у руках. Аднак калектыў Дома дружбы не мае сумненняў, што яго карпатлівая работа заўважаецца і цэніцца дзяржавай. Да юбілейных дат свайго стварэння таварыства не раз атрымлівала ганаровыя граматы і віншавальныя лісты самага высокага ўзроўню, адзначаліся ўзнагародамі і званнямі за творчы ўклад ва ўмацаванне міжнародных культурных сувязей і многія актывісты БелТД. Павагай кіраўніцтва краіны карысталіся і колішнія кіраўнікі грамадскай арганізацыі Арсен Мікалаевіч Ваніцкі і Віталь Сцяпанавіч Смірноў, якія шмат гадоў стаялі ля штурвала карабля сяброўства.

«Беларускае таварыства дружбы пастаянна адчувае сваю запатрабаванасць і станоўчыя адносіны з боку дзяржаўных структур, – гаворыць старшыня прэзідыума Н.С. Іванова. – Нашы абласныя аддзяленні ўзначальваюць намеснікі старшынь выканаўчых камітэтаў, не адмаўляюць таварыству ў дапамозе міністэрствы: асабліва плённа супрацоўнічаем з міністэрствамі культуры і адукацыі. Нядаўна ў Доме дружбы пабывалі члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах – распытвалі аб праблемах, раіліся, як актывізаваць міжнароднае супрацоўніцтва...».

Напэўна, у святле неабходнасці ўзмацнення эканамічнага вектара знешняй палітыкі краіны БелТД магло б зрабіць ухіл у рабоце ў бок бізнес-кантактаў. Дарэчы, у папярэдніх гады з сустрэч у Доме дружбы стартавала нямала вытворчых праектаў замежных інвестараў. Цяпер, калі крызіс падштурхоўвае да рашучых дзеянняў і кіраўніцтва дзяржавы робіць шматлікія захады па лібералізацыі эканомікі, магчыма, якраз і трэба скарыстаць на ўсю моц брэнд ГА «Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі», які даўно вядомы і выклікае давер у замежжы.

Калектыў Дома дружбы гатовы выходзіць на адпаведны патрабаванням часу ўзровень работы. Верыцца, што ў справы ёсць будучае. Што належная падтрымка будзе. І тады высокая, крыху ўтапічная мара паэта Сяргея Панізніка, укладзеная ў тэкст славутага гімна БелТД: «Хутка стане Домам дружбы ўся Зямля», загучыць ужо не так утапічна.

### Замест пасляслоўя. Гісторыя чацвёртая

*Нічога асаблівага ў ёй няма – проста маленькі эпізод. Пра сяброўства, пра шчырасць ды пра той жа імідж...*

*А справа была так. Прымаючы чарговую групу французаў, Анатоль Шынкевіч вырашыў павезці іх, так бы мовіць, у беларускую глыбінку, а папросту – да сваёй маці, што жыве ў невялікай вёсцы Докшыцкага раёна. Сціплая беларуская жанчына ад душы частавала гасцей звычайнай сялянскай стравай – яечняй з салам, а на развітанне паднесла ім кошычак яек, маўляў, вазьміце, госцейкі, на дарожку! Расчуленыя такой шчырасцю госці сфатаграфаваліся разам з бабуляй і з гэтым кошыкам у руках. А праз нейкі час у французскай газеце здымак быў надрукаваны як сведчанне беларускай гасціннасці і дружалюбства і выклікаў шырокі грамадскі рэзананс.*

**Таццяна ШАБЛЫКА** ■